# Новы год без здарэнняў

«Новы год без здарэнняў». Пад такой назвай прайшло спартыўна-забаўляльнае мерапрыемства ў аддзяленні дзённага знаходжання інвалідаў ДУ «ТЦСАН Ашмянскага раёна».

У праграму былі ўключаны: віктарына «Бяспечны Новы год», гульні «Небяспечнае і бяспечнае», «Ільдзінкі, сняжынкі», жартоўныя конкурсы, спартыўныя эстафеты.

Мерапрыемства нагадала людзям з абмежаванымі магчымасцямі правілы бяспечных паводзін у навагоднія святы (як карыстацца піратэхнікай, бенгальскімі агнямі, хлапушкамі і інш.).

Вынік мерапрыемства – уручэнне памяткі «Новы год без здарэнняў», падрыхтаванай спецыялістамі аддзялення, людзям з інваліднасцю.









